# „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“.

„Савецкая Беларусь“ нарадзілася і вышла ў сьвет першага лютага гэтага году.

То была цяжкая пара для Беларусі і яе працоўнага народу. Панскі прыгон ціснуў яе бязьлітасна і безпагадна. Узмацованнае магнацтва і думкі не дапускала аб тым, што хутка прыдзе час пакінуць захоплены край і абараняць сваё жыцьцё пад сьценамі Варшавы.

Наадварот, уверанные ў сваю сілу панства пускала ў ход усе спосабы, усе хітрыкі, сілу, грошы і абман, каб прыцягнуць да сябе Вольную Беларусь, ступіць на яе цяжкім абсацам і пад звон ланцугоў вярнуць даўнейшы прыгон ля работнікаў і сялян беларускіх.

Няўтрымны зьдзек гуляў па краіне, а працоўны беларус, як і заўсёды, згінаючы сьпіну, пакорна маўчаў і чагосьці чакаў, затаіўшы вялікую помсту да сваіх угнятацеляў.

У гэты час, на ўсходняй аскраіне Беларусі, вольнай і свабоднай, у г. Смаленску, гурток беларусаў-бальшавікоў, між іншай працай не забываў аб забранай панамі частцы сваее краіны. Яе мукі і стогны адбіваліся ў іх грудзёх нястрымнай помстай, а вера ў блізкі час яе звальненьня—застаўляла выгукваць кліч узбуджэньня, кліч паўстаньня проці паноў к працоўнаму народу Беларусі, дзе-б ён ня быў.

І гэты кліч, выкладаны на паперу, складаны ў друкаваные радкі газэты, разносіўся ўсюды і казаў у кожным слове і кожным радку, што Беларусь — „Савецкая Беларусь“, што гаспадар краю—работнік і селянін, а ня крывавы польскі пан.

Што гэта ёсьце і будзе!

Жыцьцё пасьпяшыла гэта апраўдаць.

Уздым Рэвалюцыі, ахапіўшы чырвоную армію, памог ёй найхутчэй-жа скінуць панскі прыгон і зрабіць Беларусь вольнаю, Савецкаю стараною.

У Чырвоную сталіцу Беларусі - Менск, „Савецкая Беларусь“ увайшла хоць на расейскай мове, але з тым-жа духам, с тым настроем, с тэю вераю ў скорае запанаваньне комунізму па ўсім сьвеце, у захаваньне вольнай Беларусі на векі, з якімі яна і нарадзілася. Праз 20 нумараў яна трымала высока сьцяг социялістычнай Беларусі, цьвёрда і ўверана, і перадала яго нам ізноў.

*Цяпер „Савецкая Беларусь“ выходзіць у Социялістычнай Савецкай Рэспубліцы Беларусі на беларускай мове,—на мове работнікаў і сялян Беларусі.*

Яе заданьне, як і ўперад, *было будзіць* беларускі працоўны народ да *прылучэньня яго к вялікай сям'і працоўнага народу ўсяго сьвету, да прычашчэньня волям комунізму, да творчасьці новага свабоднага жыцьця.*

*„Савецкая Беларусь“—газэта беларускіх сялян і рабочых, праца ў ёй—іх абавязак.*